# ДАПАМАГАЦЬ СПРАВАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта акцыя стала пачаткам маштабнага добраўпарадкавання Курапатаў. Яе вынікам будзе з'яўленне на гэтым памятным месцы мемарыяла.

Дарэчы, які яму быць, будуць выбіраць беларусы, а не журы. Аб гэтым заявіў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**, які таксама разам са сваім першым намеснікам Ірынай Дрыгай працаваў на суботніку ў Курапатах.

Міністр адзначыў, што Міністэрства культуры дало старт конкурсу па стварэнні мемарыяла ў Курапатах, які працягнецца да 25 красавіка. Таксама абвешчаны збор сродкаў, у якім можа паўдзельнічаць кожны неабыякавы чалавек. «Што датычыцца канцэпцыі самога мемарыяла, то ён не павінен прадстаўляць сабой грандыёзны помнік, які б пацiснуў гэтае месца. Галоўнае — гэта тая ідэя, якую павінен данесці скульптар або архітэктар. Яна заключаецца ў тым, каб сапраўды пазначыць гэтае месца, дзе мы аддаём даніну памяці ўсім ахвярам», — адзначыў Барыс Святлоў.

— Да нас звяртаюцца людзі з заклікам спыніць усялякія палітычныя дэмаршы вакол гэтага месца, дзе нявінна загінулі людзі, — падкрэсліў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**. — Дзяржава аб'явіла, што гэта месца будзе добраўпарадкавана і тут будзе пабудаваны мемарыял памяці і смутку. Грамадскія арганізацыі праводзяць суботнік, і гэтай працоўнай акцыяй мы паказваем сваю салідарнасць па гэтым пытанні і ўносім свой уклад у супольную справу.

**Старшыня цэхавага камітэта Мінскага трактарнага завода Аляксандр ЦІШКЕВІЧ** удзельнічаў у суботніку ўжо не першы раз. «Наша прадпрыемства заўсёды стараецца дапамагчы захоўваць гістарычныя каштоўнасці Беларусі. На такіх рэчах выхоўваюцца пакаленні, таму мы павінны ўтрымліваць помнікі, такія як Брэсцкая крэпасць, Курган Славы, Трасцянец, у добрым стане. Да стварэння мемарыяла я стаўлюся выключна станоўча», — адзначыў Аляксандр.





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падтрымлівае ідэю стварыць тут помнік і **старшыня цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Ліга камуністычнай моладзі» Антон ЛОЙКА**. «Мне цяжка ўявіць, што тут павінна быць, але мне здаецца, што экспертная камісія абярэ найлепшы варыянт. Хочацца, каб тут усё было дагледжана, — падкрэсліў ён. — Як я стаўлюся да гэтага месца? Гэта месца памяці і месца смутку. Паколькі тут ляжаць мае суайчыннікі-беларусы, трэба прыходзіць і прыбіраць, таму мы і далучыліся да суботніка. У цэлым гэтая акцыя сведчыць аб тым, што мы шануем памяць нашых продкаў».

**Майстар Мінскага завода халадзільнікаў «Атлант» Дзяніс ГЛУШАНІН** заўважыў, што той, хто хоча дапамагчы, заўсёды можа прыехаць у Курапаты. «Памяць людзей павінна быць ушанавана ў першую чаргу нашымі справамі і ўчынкамі. Я прыйшоў сюды для таго, каб навесці тут парадак. І гэта будзе мой асабісты ўклад для памяці тых, хто тут пахаваны, — падкрэсліў Дзяніс. — Галоўнае — дапамагаць справамі, а не словамі. Прыязджайце сюды, дапамагайце, гэта будзе значна больш эфектыўна, чым усякія заклікі і сходы».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

*lukashevich@zviazda.by*

## ТЫМ ЧАСАМ

Аб'яўлены конкурс эскізных праектаў памятнага знака (мемарыяла) «Курапаты». Заяўкі прымаюцца да 26 красавіка ўключна. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве культуры.

Удзельнікамі конкурсу могуць быць скульптары і архітэктары, якія маюць адпаведную прафесійную адукацыю. **«Заяўкі на ўдзел прадстаўляюцца да 26 красавіка па адрасе: Мінск, праспект Пераможцаў, 11, кабінет 308. Кантактны тэлефон: +375 17 203 91 31»**, — праінфармавалі ў міністэрстве.

Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены 25 красавіка не пазней чым да 17.00 па адрасе: **Мінск, вуліца Някрасава, 3, Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Беларусі.**

«У хуткім часе будуць адкрыты дабрачынныя рахункі ў беларускіх рублях і замежнай валюце для збору сродкаў на стварэнне памятнага знака ў Курапатах», — дадалі ў міністэрстве.

Мэта конкурсу — пошук найбольш выразнага мастацкага ўвасаблення вобраза ўрочышча Курапаты як агульнанацыянальнага месца памяці і прымірэння. «Кампазіцыйнае і пластычнае выкананне памятнага знака (мемарыяла) павінна быць вытрымана ў найлепшых традыцыях класічнага і нацыянальнага манументальнага мастацтва, адлюстроўваць галоўную ідэю — увекавечання памяці ўсіх бязвінна загінулых ахвяр ХХ стагоддзя ў гісторыі Беларусі», — растлумачылі ў Міністэрстве культуры.

Памятны знак павінен быць устаноўлены ва ўрочышчы Курапаты і лаканічна ўпісвацца ў ландшафт. «Дакладнае месца размяшчэння можа быць прапанавана ўдзельнікамі конкурсу з улікам асаблівасцей праекта і яго архітэктурна-пластычнага вырашэння, уключаючы прапановы па добраўпарадкаванні тэрыторыі каля памятнага знака», — адзначылі ў міністэрстве.

■ Не забудзем

# НА КРЫЛАХ — У ВЕЧНАСЦЬ

## Пайшоў з жыцця народны мастак Беларусі Май Данцыг



Фота Марыі ВОЙЦІК.

Майстра не стала раніцай 26 сакавіка. Яму было 86.

Май Данцыг прысвяціў шмат працы, сіл, каб захаваць у мастацкім выяўленні жудасныя вобразы часоў Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннага Мінска, любіў таксама маляваць партрэты сучаснікаў. Ён напісаў партрэты Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Анатоля Анікейчыка, многіх іншых знакамітых землякоў. Работы Мая Вольфавіча захоўваюцца ў многіх музейных калекцыях — у фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Траццякоўскай галерэі ў Маскве, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, музеях і галерэях Расіі, Галандыі, Германіі, Бельгіі, Італіі, ЗША і іншых краін.

Мастак быў прыхільнікам традыцыйнага падыходу да мастацтва, лічыў, што школа, пераемнасць пакаленняў павінны захоўвацца, хваляваўся, што ўзровень сучасных работ не заўсёды застаецца па-ранейшаму высокім.

«Што трэба, каб стаць мастаком? Вялікія крылы і ўменне на іх лётаць. Багатае ўяўленне і апантанасць. Калі кіраваца толькі цаной, якая стаіць у дамове, нічога сапраўды вартага не атрымаецца. Сумна, што мастацтва сёння ператворана ў камерцыю. Гэта вялікая памылка», — лічыў Май Вольфавіч.

Мастак таксама з вялікай павагай ставіўся да «Звязды», і гэта цалкам заканамерна, бо лёс нашай газеты цесна звязаны з сям'ёй мастака. Адметна, што ў 1917 годзе першы нумар «Звязды» быў надрукаваны ў друкарні, якая належала дзядулю Мая Данцыга ■


## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже квартир, принадлежащих УП «Геосервис»**

| № лота | Описание | Начальная цена продажи без учета НДС, бел.руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Квартира с инв. №632/D-4766, 1986 г.п. Число комнат: 2. Общая площадь – 60 кв. м. Примечания: изолированное помещение – квартира, состоящая из двух жилых комнат, кухни, двух коридоров, ванной, туалета, трех кладовых, лоджии. Общая площадь квартиры по СНБ – 62,5 кв. м, жилая – 34,5 кв. м. Подъезд – 1, этаж – 1. Адрес: Минская обл., Воложинский р-н, Ивенецкий с/с, д. Рудня, 1А-2 | 22 600,60 | 2 260,00 |
| Лот №2 | Квартира с инв. №632/D-4767, 1986 г.п. Число комнат: 1. Общая площадь – 43,9 кв. м. Примечания: изолированное помещение – квартира, состоящая из одной жилой комнаты, кухни, коридора, санузла, трех кладовых, лоджии. Общая площадь квартиры по СНБ – 45,2 кв. м, жилая площадь – 19,8 кв. м. Подъезд – 1, этаж – 1. Адрес: Минская обл., Воложинский р-н, Ивенецкий с/с, д. Рудня, 1А-4 | 15 920,60 | 1 592,00 |
| Лот №3 | Квартира с инв. №632/D-4768, 1986 г.п. Число комнат: 2. Общая площадь – 59,4 кв.м. Примечания: изолированное помещение – квартира, состоящая из двух жилых комнат, кухни, двух коридоров, ванной, туалета, трех кладовых, лоджии. Общая площадь квартиры по СНБ – 61,8 кв. м, жилая – 33,5 кв. м. Подъезд – 1, этаж – 2. Адрес: Минская обл., Воложинский р-н, Ивенецкий с/с, д. Рудня, 1А-5 | 22 017,60 | 2 201,00 |
| Лот №4 | Квартира с инв. №632/D-476, 1986 г.п. Число комнат: 1. Общая площадь – 43,9 кв.м. Примечания: изолированное помещение – квартира, состоящая из одной жилой комнаты, кухни, коридора, санузла, трех кладовых, лоджии. Общая площадь квартиры по СНБ – 45,2 кв. м, жилая площадь – 19,8 кв. м. Подъезд – 1, этаж – 1. Адрес: Минская обл., Воложинский р-н, Ивенецкий с/с, д. Рудня, 1А-8 | 15 920,60 | 1 592,00 |

УСЛОВИЯ

С Победителем аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендентом на покупку, после возмещения Организатору аукциона затрат на организацию и проведение аукциона и представления копий платежных документов, подтверждающих их возмещение, но не позднее двух рабочих дней, Продавцом заключается договор купли-продажи Объекта (Объектов).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры и представить копии платежных документов, подтверждающих их возмещение в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 28.04.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%.**

**Продавец:** УП «Геосервис», 220015, г. Минск, ул. Янки Мавра, 53, к. 21, т/ф (017) 360-03-19.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, т. (017) 306-00-57.

Оформление участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется по 26.04.2017 г. на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже квартир УП «Геосервис» (Лот №__), проводимом 28 апреля 2017 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 29.03.2017 г. в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений: 26.04.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Дрозд Виктор Иванович, тел. 8 (029) 657-24-72.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения о порядке продажи жилых помещений государственного жилого фонда на аукционе, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь 17.11.2010 №1695, и Положения об организации и проведении аукционов.

Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3-й этаж. ☎ +375 17 306-00-57, +375 29 550-09-52, + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Аляксандру Мікалаевічу Бадаку, дырэктару выдавецтва рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мастацкая літаратура» ў сувязі з горам, якое яго напаткала, — трагічнай смерцю ЖОНКІ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні свайму былому супрацоўніку, дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аляксандру Мікалаевічу Бадаку і яго родным у сувязі з трагічнай гібеллю ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Калектыў УП «Мастацкая літаратура» выказвае глыбокае спачуванне дырэктару выдавецтва Алесю Мікалаевічу Бадаку і яго родным у сувязі з напаткаўшым вялікім горам — трагічнай смерцю ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Дарагі Алесь Мікалаевіч Бадак!**

**Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае Вам, Вашай дачушцы і ўсім Вашым родным шчырыя, глыбокія спачуванні з нагоды неверагоднага гора — раптоўнай, заўчаснай, да крыўднага недарэчнай смерці любай ЖОНКІ і МАЦІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Балюча суперажываем разам з Вамі. Дай Бог Вам і сям'і стойка вытрымаць гэтую вялікую страту. Мы — разам.**

**Калектыў РУП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выказвае глыбокія спачуванні дырэктару ВРУП «Мастацкая літаратура» Аляксандру Мікалаевічу Бадаку ў сувязі з горам, якое яго напаткала, і незаменнай стратай — заўчасная смерцю ЖОНКІ.**

**Калектыў УП «Выдавецтва «Вышэйшая школа» выказвае глыбокае спачуванне дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Бадаку Алесю Мікалаевічу і яго родным у сувязі з напаткаўшым горам — трагічнай смерцю ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**УП «Выдавецтва «Беларусь» перадае глыбокае спачуванне дырэктару УП «Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесю Мікалаевічу Бадаку ў сувязі з горам, якое яго напаткала, — трагічнай смерцю ЖОНКІ.**

**Калектыў ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа» выказвае глыбокія спачуванні дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Бадаку Аляксандру Мікалаевічу ў сувязі з трагічнай смерцю ЖОНКІ БАДАК ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Кіраўніцтва і калектыў выдавецтва «Народная асвета» выказваюць глыбокія спачуванні дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Бадаку Аляксандру Мікалаевічу ў сувязі з трагічнай гібеллю ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Калектыў РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» прыносіць шчырыя спачуванні Бадаку Алесю Мікалаевічу ў сувязі з трагічнай гібеллю яго ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**

**Выдавецтва «Пачатковая школа» выказвае шчырае спачуванне дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесю Бадаку ў сувязі з напаткаўшай яго вялікай стратай — трагічнай гібеллю ЖОНКІ ЖАННЫ АРСЕНЬЕЎНЫ.**